

# «БЕЛАРУСЬ БЫЛА І ЗАСТАЕЦЦА ПЕРАКАНАНЫМ ПРЫХІЛЬНІКАМ ПАГЛЫБЛЕННЯ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ»

**На нарадзе ў Прэзідэнта абмеркавалі падрыхтоўку да пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і Еўразійскага эканамічнага форуму**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 118 (30506)

# АЎТОБУС АД РАЗЕТКІ

**Як у Шклоўскім раёне перайшлі на электратранспарт**




Летась у Шклоўскім раёне запусцілі ўнікальны праект. Аўтапарк № 5 стаў першым у Беларусі, які перайшоў на электратранспарт. У рамках пастановы Урада «Белкамунмаш» перадаў райцэнтру 15 сваіх электрамашын для праверкі на адпаведнасць тэхнічным характарыстыкам. Эксперымент паказаў вельмі добрыя вынікі. Сёння ў Шклоўскім раёне электробусы паспяхова «бегаюць» па трох гарадскіх і 19 прыгарадных маршрутах, у тым ліку «Шклоў—Магілёў»...

СТАР. 5



**+TV ПРАГРАМА**
«ЖАНІЦЬБА БАЛЬЗАМІНАВА»



НА ЧЫМ ЗАРАБЛЯЮЦЬ МАХЛЯРЫ КОЛ-ЦЭНТРАЎ? 8–9



КАБ ЗАХАВАЦЬ ТАЯМНІЦУ «КАЦЮШ» 10



ПА СЕЗОНЕ

# ВОДПУСК — ГЭТА ЗДОРАВА

**Як паехаць у падарожжа і не захварэць**

Сезон водпускаў і, здавалася б, бесклапотнага адпачынку часам можа абярнуцца непрыемнасцямі са здароўем. Інфекцыі з экзатычных краін, як аказваецца, не такая ўжо і рэдкасць. Якія хваробы прывозяць беларусы з далёкіх падарожжаў і як сябе засцерагчы, распавялі эксперты.

СТАР. 8–9

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.**
**Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**
**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ISSN 1990 — 763X
25118




# «БЕЛАРУСЬ БЫЛА І ЗАСТАЕЦЦА ПРЫХІЛЬНІКАМ ПАГЛЫБЛЕННЯ

**На нарадзе ў Прэзідэнта абмеркавалі падрыхтоўку да пасяджэння і Еўразійскага эканамічнага**

Гэтыя найважнейшыя міжнародныя мерапрыемствы пройдуць 26 і 27 чэрвеня ў Мінску. Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет — гэта найвышэйшы орган Еўразійскага эканамічнага саюза. Сярод дзяржаў — удзельніц ЕАЭС — Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія. У 2025 годзе Беларусь старшынствуе ў гэтым саюзе.



## «УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДРЫХТАВАНА СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў найбуйнейшых міжнародных мерапрыемствах бягучага года — у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і ў Еўразійскім эканамічным форуме — чакаецца ўдзел прадстаўнікоў больш як двух дзясяткаў краін.

**«Нагрузка на нас прыстойная, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Мы павінны абмеркаваць гатоўнасць да гэтага мерапрыемства. Як прымаць гасцей у такім маштабе і колькасці, мы ведаем. Усё павінна быць падрыхтавана са знакам якасці і ў арганізацыйным, і, перш за ўсё, падкрэсліваю, у змястоўным плане».**

Прэзідэнт паставіў задачу забяспечыць максімальны ўзровень беларускай гасціннасці (па яго словах, гэта таксама мы ўмеем рабіць), стварыць камфортныя ўмовы для работы і пражывання гасцей.

«Асаблівая ўвага — змястоўнаму напаўненню ўсіх мерапрыемстваў: ад форуму — да работы Вышэйшага савета, — падкрэсліў беларускі лідар.

**— У саюзе ёсць што абмяркоўваць, але пасяджэнні дзеля пасяджэнняў нікому не патрэбны. Парадак дня Вышэйшага савета павінен быць насычаным і прадметным, адпавядаць нашым нацыянальным інтарэсам».**

Прэзідэнт праінфармаваў, што Еўразійская эканамічная камісія ўнесла ажно 700 аркушаў дакументаў — 4 кілаграмы матэрыялаў. «Пры гэтым ледзь не ўсе яны прапаноўваюць прыняць без абмеркавання, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Калі яны так гатовы і ўзгоднены, адпавядаюць нашым інтарэсам, як і інтарэсам іншых дзяржаў, — калі ласка. Калі там усё так добра. Калі гэта «пустая парода» без грама дабаўленай вартасці для саюза, значыць, такія пытанні ў парадак дня ўнесены быць не павінны. Я аб гэтым гавару, бо я як старшыня буду прапаноўваць гэты парадак дня».

**Прыярытэты беларускага старшынства ў Еўразійскім эканамічным саюзе ў бягучым годзе былі выкладзены ў звароце Аляксандра Лукашэнкі да кіраўнікоў дзяржаў — членаў ЕАЭС, апублікаваным у студзені 2025 года. «Яны павінны быць рэалізаваны, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Прамысловая кааперацыя,**

## Даслоўна

### НА ПАРАДКУ ДНЯ — 14 ПЫТАННЯЎ

По словах **намесніка Прэм'ер-міністра Наталлі ПЯТКЕВІЧ** (віцэ-прэм'ер надзелена паўнамоцтвамі прадстаўніка ад Беларусі ў Савеце Еўразійскай эканамічнай камісіі), кіраўнік дзяржавы заўсёды патрабуе, каб, як і любы працэс, а тым больш інтэграцыйныя аб'яднанні, якія могуць быць пляцоўкамі для размоў або клубамі па інтарэсах, былі напоўнены канкрэтным зместам.

«Каб былі разгледжаны ў тым ліку і не вельмі папулярныя або не вельмі прыемныя пытанні, і яны не замоўчваліся, і ад іх не сыходзіць, калі сёння яны стаяць на парадку дня ў дзяржавах і нашых інтэграцыйных аб'яднаннях, — канкрэтызавала намеснік кіраўніка ўрада. — Вельмі шмат выклікаў, шмат сучасных праблем, і гэтыя пытанні павінны выносіцца».

На бягучы момант, як паведаміла Наталля Пяткевіч, у парадку дня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета — 14 пытанняў. «Для ўзроўню прэзідэнтаў гэта шмат», — удакладніла яна, дадаўшы, што ў рамках ЕАЭС працуе такая структура, як Еўразійская эканамічная камісія са штатам больш як у тысячу чалавек.

Віцэ-прэм'ер звярнула ўвагу на агучанае падчас нарады патрабаванне Прэзідэнта: акрамя забеспячэння традыцыйнай беларускай гасціннасці, самае галоўнае — гэта змястоўная частка Вышэйшага савета. «Сёлета Беларусь старшынствуе ў ЕАЭС, і, як заўсёды, гэта для любога інтэграцыйнага аб'яднання вельмі добрае ўзварушванне, — заўважыла Наталля Пяткевіч.

**— Наш Прэзідэнт нікому не дае ні заснуць, ні адпачыць. І ўсё, што гадамі дзесьці там ляжала, Прэзідэнт заўсёды ўзнімае на паверхню, абазначаючы, актуалізуючы і абвастраючы. Менавіта для таго, каб гэта вырашалася».**

Віцэ-прэм'ер адзначыла, што ў ходзе рэалізацыі стратэгічных кірункаў еўразійскай інтэграцыі да 2025 года застаецца шэраг нявырашаных праблем інстытуцыйнага характару. Па яе словах, гэтыя пытанні таксама важна абмяркоўваць, не замоўчваць, каб паскорыць вырашэнне. Наталля Пяткевіч канстатавала, што кіраўнік дзяржавы нацэльвае ўсіх, каб былі выпрацаваны пазіцыя і стратэгія рэалізацыі актуальных пытанняў.

### ПРЫСУТНАСЦЬ НА ФОРУМЕ ПАЦВЕРДЗІЛІ КІРАЎНІКІ ДЗЯРЖАЎ ЕАЭС

Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ**, падчас правядзення Еўразійскага эканамічнага форуму плануецца пленарная сесія, у якой возьмуць удзел Прэзідэнт Беларусі і кіраўнікі замежных дэлегацый. Па яго словах, асабістую прысутнасць на мерапрыемстве пацвердзілі ўсе кіраўнікі дзяржаў — членаў ЕАЭС. Прэм'ер-міністр

# ПЕРАКАНАНЫМ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ»

## Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета форуму

**транспартная палітыка, фінансавы рынак, міжнароднае пазіцыянаванне і гандлёвая экспансія на знешнія рынкі, фарміраванне сацыяльнага складніка інтэграцыі — па кожным кірунку патрэбна практычная аддача ад рашэнняў, якія прымаюцца, і тых дакументаў, якія мы ў выніку падпішам. Яшчэ раз адзначу: Беларусь была і застаецца перакананым прыхільнікам паглыблення еўразійскай інтэграцыі і пабудовы эфектыўнай дзеючай агульнай эканамічнай прасторы на аснове даверу і ўзаемаразумення».**

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў пачаць нараду з арганізацыйных пытанняў правядзення Еўразійскага эканамічнага форуму і пасяджэння Вышэйшага савета, затым удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі канкрэтныя пытанні парадку дня пасяджэння, прынялі адпаведныя рашэнні.

### ЗВЫШ 2 ТЫСЯЧ УДЗЕЛЬНІКАЎ З 29 КРАІН

Аб ходзе падрыхтоўкі пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і Еўразійскага эканамічнага форуму праінфармаваў міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў. Ён паведаміў, што Еўразійскі эканамічны форум пройдзе 26 чэрвеня на базе Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра «Белэкспа».

«Прадугледжана правядзенне шасці буйных тэматычных блокаў, у якія ўключана 35 мерапрыемстваў: пленарныя сесіі, круглыя сталы, бізнес-дыялогі, — канкрэтызаваў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — Па стане на сёння, зарэгістравана парадку 2050 удзельнікаў з 29 краін, што сведчыць аб высокай цікавасці да мерапрыемства. У найбольшай ступені прадстаўлены краіны — члены ЕАЭС і краіны — нашы найбольш сур'ёзныя партнёры ў Азіі і Афрыцы».

Па словах Максіма Рыжанкова, у рамках форуму на знешняй пляцоўцы выставачнага цэнтра запланавана выстаўка сучаснай прамысловай, сельскагаспадарчай і іншай тэхнікі, на ўнутраных пляцоўках — выстаўка, прысвечаная 80-годдзю Перамогі, і экспазіцыя дасягненняў сучаснай Беларусі: кластары «Тэхналагічная краіна», «Працавітая краіна», «Прыгожая краіна».

Плануецца, што форум пачне сваю работу ў 9 гадзін раніцы прывітальным словам да яго ўдзельнікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандра Турчына і старшыні Калегіі ЕЭК Бакытжана Сагінтаева.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**




Арменіі Нікол Пашынян будзе ўдзельнічаць у форуме ў дыстанцыйным фармаце — па відэасувязі. Максім Рыжанкоў удакладніў, што сваё жаданне ўдзельнічаць у Еўразійскім эканамічным форуме выказалі дэлегацыі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Манголіі, Нікарагуа.

«Падчас пленарнай сесіі кіраўнікі дэлегацый, сярод якіх і кіраўнікі дзяржаў, падзеляцца сваім бачаннем развіцця рэгіёна, гандлёва-эканамічных, фінансавых пытанняў у ЕАЭС і ў цэлым у глабальным разрэзе, прадставяць сваё разуменне бягучай сітуацыі ў свеце, — праінфармаваў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — На наступны дзень адбудзецца Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет, на якім у вузкім і шырокім фарматах кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць бягучы парадак дня, прымуць важныя рашэнні ў адносінах перспектыў развіцця саюза. Плануецца, што будуць падпісаны два пагадненні паміж ЕАЭС і Манголіяй, паміж ЕАЭС і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якія дадуць больш шырокія магчымасці для выбудоўвання гандлёва-эканамічных адносін членаў ЕАЭС з гэтымі дзяржавамі».

Па словах міністра замежных спраў, у рамках гэтых мерапрыемстваў чакаецца афіцыйны візіт у Беларусь Прэзідэнта Кубы. Пацвердзіў свой удзел у іх і Прэзідэнт Узбекістана. Раней паведамлялася і аб планаваным візіце ў Беларусь Прэзідэнта Ірана. «Мы разумеем сітуацыю, якая адбываецца ў рэгіёне, хочам са свайго боку найхутчэйшага ўрэгулявання, наступлення міру на гэтай зямлі, — дадаў Максім Рыжанкоў. — Але пакуль у планах візіт гэтай дэлегацыі ёсць».

Акрамя таго, па яго словах, гэтымі днямі ў Беларусі будзе працаваць дэлегацыя пад кіраўніцтвам лідара М'янмы, якая таксама будзе ўдзельнічаць у Еўразійскім эканамічным форуме. У плане візіту гэтай дэлегацыі таксама наведванне шэрагу арганізацый і прадпрыемстваў нашай краіны. «Спадзяёмся, што дэлегацыі Манголіі, Эміратаў і Нікарагуа будуць дастаткова актыўныя ў вырашэнні сваіх пытанняў, таксама запланаваны двухбаковыя рабочыя візіты», — удакладніў Максім Рыжанкоў.

# «У НАС УСЁ АТРЫМАЕЦЦА»



## Прэзідэнт Расіі распавёў пра плённае супрацоўніцтва ў Саюзнай дзяржаве і стратэгічныя перспектывы ЕАЭС

У Саюзнай дзяржавы ўсё атрымаецца. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на сустрэчы з кіраўнікамі сусветных інфармацыйных агенцтваў на палях Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форуму, адказваючы на пытанне гендырэктара БелТА.

Ірына Акуловіч пацікавілася ў Прэзідэнта Расіі: ці ёсць у Саюзнай дзяржавы план Б, у выпадку калі санкцыйны націск будзе ўзмацняцца?

«Першае — гэта план А. І там прапісана, што і як мы павінны рабіць для таго, каб развіваць нашы адносіны і нашы эканомікі, — сказаў Уладзімір Пуцін. — Потым план Б. Калі нешта не атрымліваецца, глядзі план А. У нас усё атрымаецца. Нават няма ніякіх сумненняў. Таму што ўзровень тавараабароту паміж Расіяй і Беларуссю дасягнуў $50 млрд. Гэта сур'ёзныя лічбы». І рост прадаўжаецца. «Прадаўжаецца ў тым ліку за кошт каапераціі. Мы шукаем магчымасці развіцця нашых адносін у розных сферах, дзе раней, можа, і не супрацоўнічалі, або нейкае супрацоўніцтва было яшчэ з часоў Савецкага Саюза. У мікраэлектроніцы, дапусцім. Лукашэнку многія лаялі, падсмейваліся з яго за тое, што ён захоўвае нейкую савецкую планавую сістэму і гэтак далей. Папершае, гэтага няма, — адзначыў Прэзідэнт РФ. — А, па-другое, усё ж такі Аляксандр Рыгоравіч захаваў некаторыя галіны, якія цяпер, ва ўмовах жорсткіх санкцый, аказаліся як ніколі запатрабаваныя. У тым ліку прадпрыемствы ў галіне мікраэлектронікі. Так, зразумела, там трэба выходзіць на іншыя лічбы, шмат што трэба зрабіць, і ўсё гэта ў іншых краінах рабілася дзесяцігоддзямі. Але ў нас ёсць магчымасць зрабіць добры крок, такі хуткі, моцны, вялікі крок сумесна».

У нас ёсць магчымасці супрацоўніцтва ў авіябудаванні. «Недзе, можа, невялікія самалёты Беларусь можа рабіць сама, пры нашай каапераціі, а недзе ўдзельнічаць у больш глыбокай каапераціі па вытворчасці лятальных апаратаў, фінальная зборка якіх будзе адбывацца ў Расіі, — удакладніў Уладзімір Пуцін. — У нас у галіне сельгастэхнікі ўзаемная кааперацыя таго, што збіраецца на тэрыторыі Расіі, дасягае далёка за 50 працэнтаў. Я цяпер нават не буду пералічаць усё іншае. У нас вельмі шмат кірункаў узаемадзеяння. Беларусь, як вядома, адзін з найбуйнейшых сусветных пастаўшчыкоў угнаенняў. Але практычна ўвесь аб'ём ідзе цяпер на экспарт праз Расійскую Федэрацыю, праз расійскія парты».

«У нас ёсць пытанні, па якіх мы спрачаемся. Прычым гэтыя спрэчкі ідуць нон-стоп, на пастаяннай аснове. Я проста цяпер не буду ўдавацца ў дэталі, але ў канчатковым выніку мы знаходзім рашэнне заўсёды, таму што імкнёмся да пошуку шчыра. Таму знаходзім. Упэўнены, так будзе і далей», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

ЕАЭС — найбольш глыбока інтэграванае аб'яднанне на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, заявіў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. «Прычым інтэграванае менавіта не на словах, а на справе, — сказаў Уладзімір Пуцін. — Некалі Казахстан выступіў ініцыятарам стварэння ЕАЭС. За што мы ўдзячны нашым сябрам. І гэта структура развіваецца. Так, там не ўсё проста. Так, мы, можа, не гатовыя яшчэ да стварэння канчаткова адзіных рынкаў у некаторых сферах энергетыкі. Але мы да гэтага ідзём. І прыйдзем да гэтага. Тут няма ніякіх сумненняў».

Пытанне ў часе, у тэмпах, удакладніў Прэзідэнт Расіі. «Вы ведаеце, напэўна, нашы пастаянныя дыскусіі ў галіне паставак энерганосьбітаў. Мы знаходзімся тут у развязцы (дыскусій. — «Зв.»). Мы часам знаходзім вельмі арыгінальныя рашэнні. Я цяпер не хачу нават удавацца ў дэталі, каб публічна аб гэтым не гаварыць. Але мы ж знаходзім іх. Упэўнены, і далей будзем знаходзіць, — адзначыў ён. — У мяне і ў галіне супрацоўніцтва ў рамках ЕАЭС вельмі аптымістычныя настроі, і ў галіне двухбаковага ўзаемадзеяння, у тым ліку ў сферы будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Нямі тут вельмі шмат зроблена за апошнія гады. Мы дасягнулі вельмі вялікіх працэнтаў, калі ўжо на працэнты пераводзіць. І мы фактычна выканалі амаль увесь наш план. Мы вельмі важныя рэчы зрабілі ў галіне мытні і падатковай статыстыкі. Падаткі і мытня — гэта рэчы фундаментальнага характару для стварэння ўмоў далейшага супрацоўніцтва ў галіне эканомікі».

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский винодельческий завод», 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10. УНП 400051877 |

**Предмет электронных торгов – оборудование (б/у)**
**Местонахождение – Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Ульянова 2**

| № лота | инв. № | Наименование оборудования | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 001664 | Автомат асептического разлива ТВА-3 1 л | 93 890,00 |
| | 001666 | Машина для упаковки термоусадки | |
| 2 | 001665 | Автомат асептического разлива 0,2 л | 73 790,00 |
| | 001668 | Обондероливающая машина 0,2 л | |

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 21.07.2025 г. с 11.00 до 13.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.07.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Агросервис»**
**(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)**

Аукцион состоится **09.07.2025 в 11.00** по адресу:
г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352
(офис Организатора аукциона)

**Лот № 1:** изолированное помещение с инв. № 700/D-1599848 – Производственно-бытовой корпус, назначение: помещение специализированное иного назначения, пл. 2598,00 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а.

22/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – промышленная площадка для стоянки автомобилей, назначение: сооружение специализированное транспорта, пл.17110,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5.

Капитальное строение с инв. № 700/С-118290 – Кирпичное ограждение, назначение: Сооружение благоустройства, протяженностью 115,7 м. Адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/9.

Ковер напольный, 2,5х2,5, инв. № 398. Набор мебели, инв. № 399. Сплит-система TCL, инв. № 2019. Шкаф, инв. № 119. Котел твердотопливный КС-Т-80, инв. № 656. Котел твердотопливный КС-Т-80, инв. № 657. Холодильный шкаф, инв. № 84. Холодильный шкаф, инв. № 83. Гарнитур «Кабинет директора», инв. № 965. Стенка встроенная, инв. № 536. Электросирена, инв. № 3111. Стул, инв. № 540. Стул, инв. № 541. Стул, инв. № 542. Стул, инв. № 543. Стул, инв. № 544. Стул, инв. № 549. Телефакс Panasonic kx-F130, инв. № 477. Телефакс Panasonic kx-F131, инв. № 518. Телефон Panasonic kx-FPHS, инв. № 519. Телефон LX-F130, инв. № 986. Весы МК-15.3 – А21, инв. № 953. Витрина ВХС-0,28 ТАИР – 1221 (1,5), инв. № 644. Мармит, инв. № 272. Телефакс, инв. № 2600. Терминал Indenico ICT220 GPRS/Ethernet/ Dial-up с выносной клавиатурой д/ввода пин IPP 220 Contractless, инв. № 963. Факс, инв. № 502. Электронная плитка КЗ-0,5, инв. № 273. Электронный котел КПЭ 60, инв. № 274. Электроплита ПЭСМ-2, инв. № 86. Кассовый аппарат Миника 1102МИк НТС, инв. № 954. Кассовый аппарат Миника НТС 11, инв. № 500002. Кресло тканевое – 1 шт. Стул кожанный – 1 шт. Обогреватель – 1 шт. Обогреватель – 3 шт. Обогреватель – 1 шт. Огнетушитель – 2 шт. ОП-4(з) Огнетушитель – 3 шт. ОП-8 (з) Огнетушитель – 10 шт. Огнетушитель – 1 шт. Огнетушитель – 2 шт. ОП-5 – 1 шт. Радиоприемник б/у – 1 шт. Радиоприемник – 1 шт. План эвакуации на ПВХ 300х400 мм – 3 шт. Флаг государственный 0,75х1,5 мм – 1 шт. Чайник эл. – 1 шт. Чайник электрический Aresa K-1801 – 1 шт. Электрочайник Scarlett SC-EK-21S59 Stell- 1 шт. Шкаф двухстворчатый – 2 шт. Жалюзи вертикальное 10,66 кв. м – 2 шт. Часы настенные Scarlett – 1 шт. Корзина для мусора – 1 шт. Удлинитель – 1 шт. Удлинитель с сетевым фильтром 6х5 м с заземлением 10А ССА 3х0,75 600 SH-5W – 1 шт. Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP – 1 шт. Удлинитель – 1 шт. Удлинитель – 3 шт. Сетевой фильтр 1 шт. Телефон – 1 шт. Сотовый телефон – 1 шт. Телефонный аппарат Люкс 301-3 – 1 шт. Телефон Bg 2831 Step XL*gray Philips xenium – 1 шт. Светильник Дельта – 1 шт. Светильник настольный – 1 шт. Светильник РВО-220 6 м – 1 шт. Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP – 1 шт. Вентилятор напольный – 1 шт. Полотно пожарное – 1 шт. Рукав пожарный – 46 м. Багор пожарный – 1 шт. Топор пожарный – 1 шт. Лом пожарный – 1 шт. Окно ПВХ VEKA: WHS ЭО (Белый/2180*1250/S:2,725), 1 шт. Радиоузел 100У-101, инв. № 215, 1 шт.

**Начальная цена продажи: 464 064,65** бел. руб. с учетом НДС. **Сумма задатка 46 406,47** бел. рублей.

Р/с для перечисления задатков: BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901. Срок подачи документов до 12.00 08.07.2025. Срок подписания договора купли-продажи 10 календарных дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY. Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by


МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# МІНСК — БІШКЕК: ПРАЦЯГ ГОДНАГА ШЛЯХУ

## Міжпарламенцкае і рэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Кыргызстана дае добрыя вынікі

Аб гэтым ішла размова падчас сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кыргызстана ў Беларусі Эрболам СУЛТАНБАЕВЫМ.



Фота БелТА.

«Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, Мінск і Бішкек за тры дзесяцігоддзі прайшлі годны шлях. Наша ўзаемадзеянне не мае разнапланавы і глыбокі характар. Сапраўды, кіраўнікі нашых дзяржаў заклалі трывалы падмурак для нашага ўзаемадзеяння, і сёння ў нас дастаткова добрая прававая база. Гэта тыя пагадненні, якія ёсць і падпісаныя паміж урадамі нашых краін», — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна зрабіла акцэнт на інтэнсіўным развіцці адносін паміж дзвюма дзяржавамі ў розных сферах. «Вядома, гэта не можа нас не радаваць, таму што мы сапраўды бачым, якія вынікі сёння ёсць у Кыргызстана і ў эканоміцы, і ў тым, што робіцца для краіны, для народа. Гэта заслугоўвае павагі», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Асобна Наталля Качанава вылучыла такі кірунак, як міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «Парламентарыі павінны супрацоўнічаць, павінны гучна заяўляць пра магчымасць жыць у суверэнных, незалежных дзяржавах.**

**Мы бачым з вамі, што адбываецца ў свеце, і гэта не можа нас не насцярожваць», — падкрэсліла Наталля Качанава.**

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на рэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Кыргызстана. Па яе словах, гэта дае канкрэтныя вынікі. Эрбол Султанбаеў адзначыў, што Кыргызстан зацікаўлены ў такім фармаце ўзаемадзеяння: «Я хацеў бы прапанаваць разгледзець магчымасць арганізацыі і правядзення Форуму рэгіёнаў Кыргызстана і Беларусі. Ідэя форуму заключаецца ў тым, каб сабраць рэгіянальныя ўлады і бізнес-колы і даць ім магчымасць усталяваць прамыя кантакты паміж сабой, правесці прэзентацыю эканамічных, інвестыцыйных, турыстычных, іншых магчымасцяў і патэнцыялу, падпісаць адпаведныя дакументы, у тым ліку аб пабрацімскіх адносінах, а таксама камерцыйныя кантракты. Лічу, што такое мерапрыемства надасць імпульс міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву, дазволіць мясцовым уладам і бізнесу ўстанавіць непасрэдныя кантакты для далейшага ўзаемадзеяння».

Пасол звярнуў увагу, што па выніках апошняга пасяджэння кыргызска-беларускай міжурадавай камісіі была дасягнута дамоўленасць аб давядзенні ўзаемнага тавараабароту паміж краінамі да 500 мільёнаў долараў у бліжэйшыя пяць гадоў. «Гэта, вядома, з'яўляецца амбіцыйным планам, але для рэалізацыі ёсць усе магчымасці як з дапамогай непасрэднага гандлю, так і ў межах рэалізацыі кааперацыйных праектаў у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы і іншых сферах. У гэтым кірунку ёсць асобныя праекты. Напрыклад, кыргызскі бок гатовы прадаставіць сельгасугоддзі з мэтай вырошчвання цукровых буракоў для іх стабільных паставак у Беларусь. Прытым беларускі бок можа пастаўляць сельгастэхніку для рэалізацыі гэтага праекта і накіроўваць свае навуковыя напрацоўкі», — сказаў ён. Эрбол Султанбаеў расказаў, што ў яго краіне высока цэняць беларускую тэхніку і гатовыя купляць яе.

Пасол Кыргызстана таксама звярнуў увагу на тое, што сёння нашы краіны з'яўляюцца ўдзельнікамі практычна ўсіх рэгіянальных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, у рамках якіх функцыянуюць міжпарламенцкія структуры. «У сувязі з адзначаным хацеў бы вас запэўніць, што нашы парламентарыі лічаць вельмі важным працягваць работу па гарманізацыі заканадаўства абедзвюх краін і выпрацоўцы мадэльных законаў», — дадаў Эрбол Султанбаеў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ІНТЭГРАЦЫЯ

# «МЫ РАЗАМ НАДЗЕЙНА СТАІМ НА НАГАХ»

## Беларусь і Расія будуць дапаўняць адна адну ў сферы мікраэлектронікі

Аб гэтым заявіў пасол Беларусі ў Расіі Аляксандр РАГОЖНІК на Пецярбургскім міжнародным эканамічным форуме, выступаючы на сесіі «Саюзная дзяржава: на мяжы эпох», паведамляе БелТА.



«Калі казаць пра праграму па мікраэлектроніцы, то мы падпісалі з Расійскай Федэрацыяй адпаведныя дакументы, дзе размежавалі тыя тапалагічныя нормы і тыя элементы, якія робім мы і якія робіць Расійская Федэрацыя. Такім чынам, дапаўняючы адзін аднаго, мы разам надзейна стаім на нагах. Гэта ж датычыцца і абсталявання для гэтай галіны: падзелена, што робяць Расія і Беларусь. Так, мы ставім задачу поўнасцю закрыць усю тэхналагічную лінейку па гэтай спецыфіцы, каб быць самадастатковымі», — сказаў Аляксандр Рагожнік.

«Бо гэта галіна з'яўляецца базавай для развіцця ўсяго сумежнага», — растлумачыў пасол.

Таксама ён заявіў, што Беларусь гатова ўзяць удзел у рэалізацыі расійскіх нацыянальных праектаў. «Трэба адзначыць, што Расійская Федэрацыя сёння рэалізуе 19 нацыянальных праектаў. Гэта дастаткова вялікі, усёабдымны пласт работы. І Рэспубліка Беларусь з улікам тых кампетэнцый, якія ў нас ёсць, магла б цалкам паўдзельнічаць у іх рэалізацыі», — падкрэсліў пасол. Ён дадаў, што з расійскім бокам ёсць агульнае разуменне ў гэтым пытанні.

Асобна Аляксандр Рагожнік закрануў тэму транспарту і лагістыкі ў Саюзнай дзяржаве. «У гэтай сферы мы развязалі ўсе вузлы — і ўсе тавары, якія ішлі праз нашых так званых партнёраў, цяпер цудоўна ідуць транзітам праз тэрыторыю Расіі», — канстатаваў Аляксандр Рагожнік.

# АЎТОБУС АД РАЗЕТКІ

## ЭКАЛАГІЧНАСЦЬ І ЗРУЧНАСЦЬ

Пра тое, якія перамены да лепшага адбыліся, размаўляем з **дырэктарам Шклоўскага філіяла аўтапарк № 5 ААТ «Магілёўаблаўтатранс» Паўлам ЦІМОШЧАНКАМ.**

— Па-першае, абнавіўся рухомы састаў аўтапарка, — кажа суразмоўнік. — На той момант, калі пілотны праект пачынаўся, ён быў зношаны на 75 %. У перспектыве мы ўсё роўна павінны былі б абнавіцца. Па збегу абставін мы не толькі абнавіліся, але і паўдзельнічалі ў экалагічным праекце. Экалагічнасць — гэта другі, вельмі важны складнік. Сумарна мы скарацілі выкіды CO і CH у атмасферу парадку на 2,5 тоны ў год. Па-трэцяе, наш транспарт стаў больш зручным для пасажыраў — гэта адсутнасць шуму, вібрацыі, паху ў аўтобусе. Па-чацвёртае, атрымалася аблегчыць працу вадзіцеля. Гэты від транспарту больш камфортны, чым аўтобусы з механічнай трансмісіяй. Спала напружанасць рабочага працэсу.





І гэта не адзіныя плюсы. У аўтапарка атрымалася знізіць затраты на паліва і змазачныя матэрыялы на 40 %. Раней выдаткі на паліва складалі 54 капейкі на кіламетр, цяпер — 26.

— Грошы, якія мы выручылі ад рэалізацыі гэтага пілотнага праекта, накіравалі на рост дабрабыту калектыву — павысілі зарплату вадзіцелям і работнікам філіяла на 35 %, — падкрэслівае дырэктар. — Разам з гэтым на высокую планку паднялі прэстыж прафесіі вадзіцеля. І працоўнае месца стала больш камфортнае, і зарплата падрасла.

Для сілкавання транспарту была пераабсталяваная трансфарматарная падстанцыя — заменены трансфарматары і падведзены кабельныя лініі для зарадных станцый. На тэрыторыі аўтапарка сёння функцыянуе 8 зарадных станцый, на 6 з якіх адначасова могуць зараджацца два электробусы і на дзвюх — па адным.

## НЕ ПРАЦА, А АДПАЧЫНАК

У аўтапарку працуе 15 вадзіцеляў, самаму маладому — 26 гадоў. Ён прыйшоў сюды адразу ж пасля арміі, задаволены і работай, і зарплатай, якая больш за 2 тысячы рублёў. Усе кіроўцы вопытныя, паспяхова прайшлі перападрыхтоўку для работы на электробусах. У Шклоў з Мінска прыязджаў спецыяліст, які паказаў устройства новай машыны і прынцып кіравання ёй.

— Вельмі зручны транспарт, — пацвярджае **вадзіцель Мікалай ДЗМІТРЫЕЎ.** — У яго шмат пераваг. Крэсла камфортнае, ёсць тры становішчы. Спіна больш не баліць. І непрыемных пахаў у салоне няма. З падзарадкай праблем не ўзнікае. Вытворца гарантаваў, што адной зарадкі хопіць на 200 кіламетраў, але летам яе хапае і на больш. А зараджаецца машына прыкладна 4-6 гадзін.

**Вадзіцель Васіль ЯЛАМА** працуе нядаўна, але і яму ёсць з чым параўнаць — паспеў і на старых машынах паездзіць.

— На электробусе, канешне, камфортна, — кажа ён. — Кабіна бóльшая, крэсла з падлакотнікамі. Машына рухаецца мякчэй і цішэй, кіроўцу зручна ездзіць. Кіраванне аўтаматычнае, для руху наперад ці назад — толькі кнопкі націскай. Педалі прымяняюцца толькі, каб тармазіць або паддаць газу. Адзінае шкада, што кандыцыянер адсутнічае. Зімой тэмпература ў салоне рэгулюецца з панэлі, а восень летам ахалоджваемся натуральным шляхам — праз фортачкі. Аднак гэта дробязі, пераваг нашмат больш.

**У адрозненне ад сваіх сабратаў з механічнай трансмісіяй, электробусы яшчэ і даўжэйшыя па памеры, а значыць, больш умяшчальныя. Аўтобусы былі ад 7 да 12 метраў, а гэтыя — 12,5. Са старых аўтобусаў у аўтапарку засталося толькі некалькі машын для выканання заказаў ад насельніцтва, астатнія перададзеныя іншым аўтапаркам, якія мелі патрэбу.**

## ТРАНСПАРТ БУДУЧАГА

Павел Цімошчанка з веданнем справы гаворыць, што беларускія электробусы не горшыя еўрапейскіх аналагаў.

— Мы наогул зрабілі вялікі крок наперад па вытворчасці машын і абсталявання, — кажа ён. — Вельмі добрая зборка, якасць вузлоў і агрэгатаў. Наш айчынны аўтапрам вельмі сур'ёзна развіваецца. Нядаўна мы набылі МАЗ 6516 — камплектуючыя і эрганоміка нічым не адрозніваюцца ад еўрапейскіх. Мы, можна казаць, у топе. Навука і тэхніка ў Беларусі развіваюцца імкліва. Электрамабілі — гэта сур'ёзная заяўка на будучыню. Добра, што ўпор робіцца на іх. У Беларусі ёсць АЭС і свая электраэнергія. Кілават для нашай зараднай станцыі каштуе 26 капеек. Усё робіцца для таго, каб электратранспарт развіваўся. За ім будучыня. Экалогію за грошы не купіш. Яе трэба берагчы. Для вялікіх гарадоў, дзе высокая загазаванасць, электробусы наогул неабходнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*г. Шклоў.*



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении электронного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению **филиала «Дорожно-эксплуатационное управление № 66» Республиканского унитарного предприятия «Минскавтодор-Центр»** (222397, Минская область, г. Мядель, ул. Коммунальная, 5) проводит открытый аукцион по продаже

**автомобиля легкового внедорожного универсала**

**LADA-21214-120-40,**

**2011 г. в., регистрационный знак 3677 КН-5, кузов № ХТА212140С2049274, цвет тёмно-бордовый, инвентарный номер 977, находящегося по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. Коммунальная, 5.**

**Начальная цена** (без НДС) – **5 640,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **564,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **21.07.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.07.2025** до **17.00. Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**

**Тел для осмотра транспорта (8 033) 902 70 07, время осмотра с 09.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНН 600540271

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «Династия Эстэйт Плюс»**
(Продавец) на праве собственности

**Электронные торги состоятся 21.07.2025 в 10.00**

**Лот № 1 в составе:** 1. Административное здание с инв. № 421/С-8244, 1234,8 кв. м. 2. Проходная с инв. № 421/С-8245, 32,0 кв. м. 3. Материальный склад с инв. № 421/С-8246, 300,0 кв. м.
Земельный участок 421356200001000278 (0,5609 га). Право аренды.
**Адрес:** 1. Гродненская обл., Вороновский р-н, г. п. Радунь, ул. 13 Июля, 23А, административное здание. 2. Гродненская обл., Вороновский р-н, г. п. Радунь, ул. 13 Июля, 23А/1. 3. Гродненская обл., Вороновский р-н, г. п. Радунь, ул. 13 Июля, 23А/2, материальный склад.
Начальная цена – **42 941,62** руб. с учетом НДС 20 %.
Задаток – **4 294,16** руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 17.07.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ООО «НикаПроект»,

опубликованную в газете «Звязда» от 26.02.2021 г. по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр-т Жукова в г. Минске» 3-я очередь строительства 3-7-я секции

**Застройщик** – общество с ограниченной ответственностью «НикаПроект», зарегистрированное в ЕГР22.03.2011 за № 191581623.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Богдановича, д. 155, оф. 810, тел. +375 29 647 70 00

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договора создания объектов долевого строительства предлагается 3 квартиры.**

Стоимость строительства определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади объектов долевого строительства в текущих ценах составляет:

- жилое помещение (квартира), общая площадь 40,86 кв. м – за 1 кв. м, эквивалентной 2100 долларов США;
- жилое помещение (квартира), общая площадь 41,15 кв. м – за 1 кв. м, эквивалентной 2100 долларов США.

**Условия оплаты:**

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости помещения;
- при кредитовании оплата стоимости объекта долевого строительства производится единовременно в полном объёме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «БешЛесИнвест»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1391 | Рохли, инв. № 00000004 и инв. № 00000005 | 1200,00 | 120,00 | 60,00 |
| 1393 | Станок для разводки ленточных пил RWM 2016 г. в., инв. № 00000019 | 900,00 | 90,00 | 45,00 |
| 1394 | Станок для заточки дисковых пил 2016 года выпуска, SOPW-150 для деревообрабатывающего оборудования, инв. № 00000023 | 1200,00 | 120,00 | 60,00 |

В отношении лотов проводятся вторые повторные торги. Стоимость снижена на 50 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 07.05.2025

Местонахождение лотов: Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1Д, корп. 2

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | 2 июля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 20 июня 2025 года до 16.00 30 июня 2025 года |

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901 Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «БешЛесИнвест», проводимых 02.07.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1393 – 10 %, по лотам №№ 1391, 1394 – 9 % от конечной цены предмета торгов.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте: https://orgtorg.by.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов с понедельника по пятницу по предварительному согласованию, тел. +375447513892, e-mail: schl6405@mail.ru (ликвидатор).

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | Общество с ограниченной ответственностью «БешЛес Инвест» в лице ликвидатора – ООО «С чистого листа», тел. +375447513892 (Республика Беларусь, 211361, Витебская область, Бешенковичский район, г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1В, УНП 391016510) |
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера», 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. +375 (29) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg |



## ИНФОРМАЦИЯ о проведении повторного электронного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64), по поручению **ГУ «Копыльский территориальный центр социального обслуживания населения»** (223927, г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 16А), проводит открытый аукцион по продаже

## легкового специального автомобиля PEUGEOT PARTNER,

2007 г. в., рег. знак 6668 МК-5, инв. № по бух. учету 01510004, кузов (VIN) VF3GJ9HXC95284837, находящегося по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. пл. Ленина.

Начальная цена (без НДС) – **2 970,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **297,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 70 %.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 28.12.2024, 15.02.2025, 03.05.2025.

Электронные торги состоятся 10.07.2025 в 10.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.07.2025 до 17.00. Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.

УНП 690295749


ПОВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

# КАБ МОЛАДЗЬ ВЕДАЛА НАЙНОЎШУЮ ГІСТОРЫЮ

## Адкрылася першая ў краіне музейная экспазіцыя, прысвечаная УНС

У сталічнай гімназіі № 37 адкрылася першая ў краіне музейная экспазіцыя «Гісторыя адзінства», якая прысвечана Усебеларускаму народнаму сходу і ўяўляе сабой адукацыйную і культурную прастору, створаную для захавання і папулярызацыі матэрыялаў аб дзейнасці органа.




Ініцыятарам праекта стала **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Прэзідыума УНС Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ:** «Слоган нашай гістарычнай экспазіцыі «Адзінства народа — адзінства пакаленняў», — адзначыла дэпутат. — Таму сімвалічна, што размясцілася яна ва ўстанове адукацыі. Яе мэта — выявіць і захаваць прадметы, а таксама навукова-дапаможныя матэрыялы аб Усебеларускім народным сходзе. Іх вывучэнне, улік, экспанаванне і папулярызацыя будуць спрыяць адукацыйным і выхаваўчым задачам установы адукацыі, патрыятычнаму выхаванню школьнікаў, фарміраванню пачуцця датычнасці да нашай гісторыі, паважліваму стаўленню да дзяржаўных сімвалаў і інстытута дзяржаўнай улады. Магчыма, наша лакальная ініцыятыва стане пачаткам вялікага дзяржаўнага праекта,

АДУКАЦЫЯ

# ПРАФЕСІЯ — МАЙСТАР,

## У гэтым каледжы рыхтуюць спецыялістаў, якія сёння асабліва

Філіял «Індустрыяльна-педагагічны каледж» (ІПК) установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі» з багатай гісторыяй, якая пачалася ў далёкім пасляваенным 1947-м, сёння называюць адным з самых сучасных і тэхналагічных. А яшчэ ён унікальны тым, што тут разам са спецыялістамі будаўнічых прафесій і мэблевай вытворчасці рыхтуюць прафесіяналаў педагагічнага профілю — майстроў вытворчага навучання і настаўнікаў тэхнічнай працы і чарчэння.

На прыступках перад уваходам у каледж чародка дзяўчат нешта ажыўлена абмяркоўвала. Падышоўшы да іх бліжэй, зразумела, што гаворка ідзе пра тое, пра што звычайна гавораць юныя лэдзі за сценамі навучальнага класа, — пра ўборы, хуткія канікулы і іншыя дзявочыя дробязі. Маладыя, вясёлыя... І было цяжка ўявіць, што праз нейкі час некаторыя з іх пачнуць навучаць прафесіі іншых, а ў вучнях будуць практычна іх аднагодкі.

### ДЗЕ ВУЧЫЎСЯ, ТАМ І СПАТРЭБІЎСЯ

— А вы не здзіўляйцеся, — адказвае на мае сумненні **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце каледжа Антаніна БЯГАНСКАЯ.** — У нас дзяўчаты паспяхова асвойваюць прафесіі зваршчыка, муляра і іншыя, якія прынята лічыць зусім не жаночымі.

Так пачалося наша знаёмства з педагогам, чыя працоўная дзейнасць — ад студэнцтва і да сённяшняга дня — звязана з каледжам. Прыйшла сюды выпускніцай цяперашняга БНТУ ў 1997 годзе і вырашыла спыніцца на выкладанні. Для гэтага інжынеру-будаўніку прыйшлося «перакваліфікавацца», атрымаўшы яшчэ адну адукацыю па педагагічным профілі. У выніку сёння Антаніна Уладзіміраўна кіруе вучэбнай работай у якасці намесніка дырэктара ІПК і ведае пра родную ўстанову адукацыі ўсё. Напрыклад тое, што ў каледжы ёсць выдатная традыцыя выхоўваць кадры ўнутры калектыву, развіваць іх, даваць пуцёўку ў жыццё.

З адным з такіх выпускнікоў мы знаёмімся ў Цэнтры кампетэнцыі сучасных зварачных тэхналогій.

— Каледж стаў часткай майго жыцця, — расказвае **намеснік дырэктара па вытворчым навучанні Сяргей РЫБАК.** — Я прайшоў тры ступені адукацыі — прафесійна-тэхнічную, сярэдне-спецыяльную і вышэйшую — і лічу гэта правільным. Па-першае, шматступенная траекторыя адукацыі дапамагае стаць сапраўдным прафесіяналам з вялікім досведам. Па-другое, кожная новая ступень дадае жыццёвага вопыту. І калі ты прыходзіш на сваё працоўнае месца ў якасці майстра вытворчага навучання, ты ўжо ведаеш, як і чаму перш за ўсё трэба вучыць моладзь: паважаць выбраную прафесію, ганарыцца ёю. Калі ёсць гэта пачуццё, то навучыцца працоўным навыкам значна лягчэй.

### ЦЭНТР ПРЫЦЯГНЕННЯ

Цэнтр кампетэнцыі, у якім праходзіла наша гутарка — гэта гонар каледжа і мара кожнага сучаснага зваршчыка. У яго арсенале нарыхтоўчая майстэрня з оптавалаконным лазерным станком для рэзкі металу, машына плазменнай і газакіслароднай рэзкі з ЧПУ, прасторная зварачная майстэрня з індывідуальнымі боксамі, у якіх навучэнцы










бо станаўленне і эвалюцыя УНС — важная старонка гісторыі Беларусі».

Экспазіцыя мае асаблівае значэнне перш за ўсё для маладзёжнай аўдыторыі. Важна, каб падлеткі ведалі, як праходзіла станаўленне, якімі падзеямі напоўнена гісторыя роднай краіны. Менавіта Усебеларускі народны сход як вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Беларусі прымае рашэнні, якія з'яўляюцца вектарамі яе далейшага развіцця. Ён — цяпер ужо ў сваім новым канстытуцыйным статусе — выконвае вельмі важныя задачы. У тым ліку захаванне суверэнітэту, непахіснасць канстытуцыйнага ладу і пераемнасць пакаленняў.

Паводле слоў Марыны Лянчэўскай, для лепшага пагружэння ў тэму музейнай экспазіцыі распрацаваны спецыяльны дызайн памяшкання, а для яе напаўнення выкарыстаны архіўныя матэрыялы Прэзідэнцкай бібліятэкі, Беларускага дзяржаўнага архіва, фатаграфіі дзяржаўных СМІ. Для стварэння інтэрактыўнасці існуюць QR-коды, якія накіроўваюць на фота, відэа, дакументы, якія адносяцца да дзейнасці УНС.

**Кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы Арцём ШАГІДЗЕВІЧ** адзначыў, што ўнікальнасць экспазіцыі заключаецца ва ўвасабленні ёю народнага адзінства. «Усе разам сабраліся, арганізаваліся і зрабілі. Спадзяюся, што гэты вопыт будзе прымножаны як мінімум у Фрунзенскім раёне горада Мінска. Ён можа паслужыць добрай ідэяй і для іншых».

**Сямікласнік сталічнай гімназіі № 37 Данііл ЛЕЎШЫН** стаў удзельнікам конкурсу макетаў значных аб'ектаў нашай краіны, якія былі пабудаваныя ў перыяд з 1996 па 2024 гады. Макеты якраз сталі часткай музейнай экспазіцыі, яна яшчэ будзе папаўняцца экспанатамі: «Мы з мамай скансруявалі макет Дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. Наша работа прымеркавана да 80-годдзя Перамогі. Перш чым зрабіць макет, мы з сям'ёй хадзілі на экскурсію ў гэты самы музей. Вельмі ўразіліся! Вынікам стаў цяпер ужо экспанат музейны».

Дарэчы, у рамках мерапрыемства ад імя арганізацыі РГА «Белая Русь» Фрунзенскага раёна прайшло ўзнагароджанне тых вучняў гімназіі, якія бралі ўдзел у конкурсе макетаў, сярод якіх — макеты Палаца Рэспублікі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, «Мінск-арэна» і іншыя.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара.**

# ПРЫЗВАННЕ — ПЕДАГОГ

## запатрабаваныя

адточваюць навыкі па ўсіх відах зваркі. У лабараторыі механізацыі і аўтаматызацыі зварачнай вытворчасці ўсталяваны трэнажор з дапоўненай рэальнасцю, які дапамагае адпрацоўваць задачы па накладанні швоў на ўсе асноўныя тыпы зварных злучэнняў. Такая рэальнасць дае эфект «жывога» працэсу, але ў той жа час не наносіць шкоды здароўю навучэнца, эканоміць рабочыя матэрыялы і электраэнергію.


Прызер міжнароднага конкурсу ProfSkills гэтага года Кірыл Шакун.

Будучы зваршчык, экіпіраваны ахоўнай маскай, з гарэлкай у руцэ, бачыць шво, як кладзецца метал, і нават чуе рэальны шум зварачнага працэсу — так развіваецца маторная памяць. Вынік працы навучэнец праглядае ў 3D-мадэлі. Прамысловы рабатызаваны зварачны комплекс можа выконваць работы любой складанасці, забяспечваючы найвышэйшую якасць.

— Наш Цэнтр кампетэнцыі з'яўляецца ў прамым сэнсе і цэнтрам прыцягнення, —кажа Сяргей Рыбак. — Тут праводзяць навучальныя практыкі і вытворчае навучанне для студэнтаў з іншых навучальных устаноў.

У цэнтр, па словах намесніка дырэктара па вытворчым навучанні, зазіраюць нават вопытныя зваршчыкі — падшліфаваць сваё майстэрства ва ўмовах сучасных тэхналогій.

## ПА НОВЫХ КІРУНКАХ

Каледж, якому ў гэтым годзе спаўняецца 78 гадоў, шмат у чым з'яўляецца наватарам сучасных рашэнняў у сферы адукацыі. Менавіта тут у рамках спецыяльнасці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» стартавала эксперыментальная практыкаарыентаваная праграма па ўкараненні BIM-тэхналогій (інфармацыйнага мадэліравання) у навучальны працэс. Такім чынам, упершыню ў краіне будучыя спецыялісты з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй атрымалі магчымасць вывучаць лічбавыя праграмныя прадукты.

— Нават выкладчыкі каледжа прайшлі спецыяльную падрыхтоўку па засваенні BIM-тэхналогій, — гаворыць намеснік дырэктара Антаніна Бяганская.

Аналіз рынку працы, па яе словах, пастаянны абавязак педкалектыву ІПК. Гэта дае разуменне, якія спецыялісты там патрабуюцца. А з разуменнем прыходзіць і неабходнасць адкрываць навучанне на сучасныя і запатрабаваныя спецыяльнасці, у тым ліку звязаныя з педагагічнай дзейнасцю ў вытворчай сферы.

— Сярод іх — «Тэхнічная праца і чарчэнне» з кваліфікацыяй настаўніка, «Мантаж і эксплуатацыя электраабсталявання» з кваліфікацыяй тэхніка-электрыка і майстра вытворчага навучання, «Вытворчасць мэблі (педагагічная дзейнасць)» з кваліфікацыяй майстра мэблевай вытворчасці і майстра вытворчага навучання, а таксама «Будаўніцтва будынкаў і збудаванняў (педагагічная дзейнасць)» з кваліфікацыяй тэхніка-будаўніка і майстра вытворчага навучання, — пералічвае намеснік дырэктара. — Акрамя таго, ёсць спецыяльнасці, звязаныя з эксплуатацыяй і ўзвядзеннем будынкаў і збудаванняў, у тым ліку энергаэфектыўных, а таксама мантажом і эксплуатацыяй санітарна-тэхнічнага абсталявання. У каледжы рыхтуюць спецыялістаў і па арганізацыі атэльных і турыстычных паслуг.

## СПЕЦЫЯЛІСТ І ПЕДАГОГ

— Якімі якасцямі павінен валодаць майстар вытворчага навучання? — з гэтым пытаннем мы звярнуліся да **выкладчыка вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ІПК Ірыны СІЛІНАЙ.**

— Гэта і педагог, і высокакваліфікаваны спецыяліст у сваёй сферы, настаўнік, — адказвае яна. — А асаблівасцю гэтай спецыяльнасці і адрозненнем ад педагагічнай працы з'яўляецца тое, што выпускнік вучыць сваіх падапечных не за партамі, а на практыцы.

На думку суразмоўцы, майстар вытворчага навучання — прафесія шматгранная, бо спецыялісту даводзіцца мець справу і з людзьмі, і з тэхнікай, і з абсталяваннем. Вялікае значэнне маюць асабістыя якасці настаўніка — вытрымка і настойлівасць, здольнасць пераконваць і выразна фармуляваць свае думкі, даходліва тлумачыць і пры гэтым абавязкова мець шырокі кругагляд.

— Акрамя гэтага, ужо пры праходжанні педагагічнай і пераддыпломнай практык будучы майстар вытворчага навучання асвойвае навык аналізу сваёй працы: адсочвае дынаміку, знаходзіць прычыны поспехаў і недахопаў і думае над тым, якія ўжываць стымулы для матывацыі або больш дзейсныя формы і метады практычнага навучання, — падкрэслівае выкладчык.

Для таго каб усё гэта прасоўваць і зрабіць падрыхтоўку майстроў максімальна практыкаарыентаванай, з мінулага года ІПК удзельнічае ў рэспубліканскім эксперыменце па распрацоўцы і апрабацыі навукова-педагагічнага модуля пры падрыхтоўцы майстроў вытворчага навучання.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


**ИНФОРМАЦИЯ**
**о проведении повторного аукциона**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321), по поручению УП «Коммунальник» (продавец, г. Молодечно, ул. Великосельская, 38в, тел. 80176-58-30-14, проводит открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1:**

изолированного помещения

с инв. № 630/D-38765 общей площадью 191,7 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 1-4. Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623855700002000005, пл. – 0,1720 га.

Начальная цена без НДС– **51 360,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **5 136,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 20 %.

**Лот № 2:**

изолированного помещения

с инв. № 630/D-45414 общей площадью 864,1 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 121В-3. Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 642000000003000674, пл. – 0,1474 га.

Начальная цена без НДС– **406 400,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **40 640,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 20 %.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 02.04.2025.

**Аукцион состоится 08.07.2025 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.07.2025 до 17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

УНН 600029451



**ООО «Юридическая компания Аспект»**
проводит восьмые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия
**«Юколанефть»**

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728) на общую сумму 39 876,99 бел. руб. | 10 716,49 | 535,82 | 1 071,65 |
| 2 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458) на общую сумму 2 745,88 бел.руб. | 737,93 | 36,90 | 73,79 |

Торги назначены на 08.07.2025 г. в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж). Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до 07.07.2025 г. включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)

| | |
|---|---|
| Продавец | Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть» |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть» р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 192140296 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2024 (стр. 6), 22.10.2024 (стр. 14), 13.11.2024 (стр. 12), 22.01.2025 г. (стр. 14), 08.02.2025 г. (стр. 12), 05.03.2025 г. (стр. 8), 12.04.2025 г. (стр. 4), 10.05.2025 г. (стр. 11)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по комбинированной схеме
(на повышение и понижение цены движимого имущества)
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец)
на праве собственности

**Электронные торги состоятся 02.07.2025**

**Лот № 1:** GAZ-2752, кузов (рама) № 275200D0526400 X96275200D0749627. 2013 г. в.
**Местонахождение:** Гомельская область, Гомельский р-н, Урицкий с/с, 1.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 6 360,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 %** – 5 724,00 руб. **Задаток** – 636,00 руб. **Шаг электронных торгов на повышение** – 5 % от начальной цены (318,00 руб.). **Шаг электронных торгов на понижение** – 5 % от начальной цены (318,00 руб.).
Срок для подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом ЭТП и Правилами проведения электронных торгов по комбинированной схеме, размещенными на детальной странице лота на ЭТП.
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 30.06.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 29 июля 2025 г. в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов.**

ЛОТ № 1: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

| № п/п | Наименование основных средств | Основные технические и эксплуатационные характеристики | Инвентарный номер | Дата ввода в эксплуатацию |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Туалет кирпичный | Капитальное строение с инв. номером 730/С-13483, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Крупской (Общая площадь: 1,43 кв. м. Наименование: туалет кирпичный. Назначение: здание специализированное коммунального хозяйства) | 00110203 | Декабрь 2007 г. |
| 2 | Пост охраны отделения | Капитальное строение с инв. номером 730/С-423, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Крупская, д. 1Б (общая площадь: 19,85 кв. м. Наименование: пост охраны отделения. Назначение: здание специализированное) | 00110129 | Декабрь 2004 г. |
| 3 | Лестница для 3-й проходной из металла б/у | Металлическая лестница к посту охраны | 00220265 | Июнь 2011 г. |
| 4 | Забор вокруг территории завода | Капитальное строение с инв. номером 730/С-13297, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4. Назначение: сооружение неустановленного назначения. Длина: 511 м | 00220050 (часть объекта) | Декабрь 1948 г. |
| 5 | Площадка проходной по ул. Крупской (1050 м²) в составе автодороги внутризаводские) | Бетонная площадка площадью 1050 м² | 00220048-1 (часть объекта) | - |
| 6 | Автодорога | Автомобильная дорога, покрытие бетонное площадью 2650 м | 00220048-1 (часть объекта) | |

Начальная цена продажи лота № 1 с учетом НДС (20 %) составляет: 97 284,00 (девяносто семь тысяч двести восемьдесят четыре белорусских рубля 00 копеек), задаток 9 728,40 (девять тысяч семьсот двадцать восемь белорусских рублей 40 копеек).

Собственник имущества: Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

Организатор торгов: унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1 к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность – представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт, иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 29 июля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к.112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – 28 июля 2025 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 29 июля 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30



Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Кулеш Галины Николаевны № 192415260 от 29.01.2015 г. в связи с утерей считать недействительным.

УНП 193311532



Утерянный страховой полис «Страховой полис добровольного страхования имущества граждан», ГО, несч./сл. серии ИД № 4238315 в представительстве Белгосстраха по Минскому району считать недействительным.

УНН 100122726


ГУЧНАЯ СПРАВА

# КРУХМАЛ ПАД ВЫГЛЯДАМ ЛЕКАЎ

## У Беларусі затрыманы арганізатары махлярскіх кол-цэнтраў

Беларускія праваахоўнікі выявілі сетку кол-цэнтраў, якія прадавалі харчовыя дабаўкі пад выглядам лекаў. Пілюлі, якія па сутнасці складаліся з крухмалу і каштавалі 1-3 рублі, махляры прадавалі даверлівым грамадзянам мінімум па 135 рублёў. У выніку за час сваёй злачыннай дзейнасці арганізатар сеткі стаў доларавым мільянерам, а шэраг яго ахвяр страцілі да 8 тысяч рублёў. Толькі сёлета махляры прадалі свае «цуда-лекі» 8 тысяч разоў, а з моманту заснавання — 170 тысяч. Падазраванымі па крымінальнай справе прызнаны 56 чалавек, 6 з іх заключаны пад варту.



### «АЛТАЙСКАЕ ЗДАРОЎЕ» ПАДВЯЛО

Грамадзянін Расіі, раней асуджаны за незаконны абарот наркотыкаў, які апошнія 10 гадоў жыў у Беларусі, у 2021-м запусціў сетку махлярскіх кол-цэнтраў і інтэрнэт-магазінаў. Яго правай рукой з'яўляўся беларус, раней неаднаразова судзімы за махлярства, падробку дакументаў і дачу хабару. Кол-цэнтры дзейнічалі ў Мінску, Барысаве, Баранавічах і Бабруйску. Акрамя таго, ствараліся яркія сайты-пасткі, напоўненыя лжывымі водгукамі і псеўдамедыцынскімі рэкамендацыямі. Выкарыстоўваліся, напрыклад, такія лжывыя фармуліроўкі, як «міжнароднае аб'яднанне аховы здароўя», «ананімнае дзяржаўнае апытанне», «сацыяльная скідка», «праграма дапамогі сярод насельніцтва Беларусі».

— Супрацоўнікі нашага ўпраўлення атрымалі інфармацыю аб дзейнасці сеткі кол-цэнтраў. Праз іх грамадзянам прадавалі харчовыя прадукты пад выглядам сродкаў, якія валодаюць высокаэфектыўнымі лячэбнымі ўласцівасцямі, асабліва для лячэння розных узроставых і хранічных захворванняў, — расказаў **начальнік другога аддзела пятага ўпраўлення (па г. Мінску) ГУБАЗіК МУС Сяргей ВАНАГЕЛЬ.**

Механізм падману грамадзян выглядаў наступным чынам. Махляры распаўсюджвалі ў інтэрнэце і друкаваных выданнях фіктыўныя рэкамендацыі ўрачоў, фальшывыя сертыфікаты якасці і няпэўныя даныя аб клінічных і лабараторных даследаваннях. Таксама выпускаліся і распаўсюджваліся друкаваныя выданні, дзе размяшчалі водгукі выдуманых людзей, якія нібыта вылечыліся ад хранічных захворванняў. Для гэтага выкарыстоўвалі фота акцёраў, у тым ліку і галівудскіх, напрыклад Анджэліны Джалі. Пісалі, што гэта Ганна, жыхарка горада Буда-Кашалёва, 35 гадоў, якая вылечылася ад хранічнага захворвання.

Такім чынам патэнцыяльных пакупнікоў уводзілі ў зман, стваралі ілюзію пацверджанай эфектыўнасці «цудадзейных сродкаў». Пад выглядам лекаў завод у Алтайскім краі выпускаў банальную харчовую прадукцыю пад маркай «Алтайскае здароўе», у аснове якой — крухмал. Адметна, што выраблялася яна спецыяльна для заказчыка, з улікам яго патрабаванняў.

### САЙТЫ-ПАСТКІ І «ДАСЬЕ» НА КОЖНАГА ПАКУПНІКА

Для фарміравання кліенцкай базы ашуканцы выкарыстоўвалі спецыяльна створаныя сайты-пасткі. Людзі, якія праяўлялі цікавасць да прадукцыі, пакідалі на сайце свае кантакты. Пасля гэтага яны адразу траплялі ў поле зроку ашуканцаў з кол-цэнтраў. Тыя выкарыстоўвалі розныя хітрыкі, каб пераканаць грамадзян набыць прадукцыю. Напрыклад, людзей схілялі адмовіцца ад медыкаментознага лячэння на карысць «высокаэфектыўных экстраардынарных раслінных комплексаў».

На кожнага патэнцыяльнага пакупніка ў махляроў была складзена інфармацыйная база з указаннем асабістых даных, у тым ліку хвароб, якія той меў, асаблівасцяў характару чалавека і яго слабых месцаў, на якія можна націснуць. Гэтыя звесткі «менеджары» збіралі падчас шматлікіх тэлефанаванняў сваім ахвярам.

**Праваахоўнікі выявілі, што для маскіроўкі злачыннай дзейнасці, а таксама надання ёй бачнасці законных грамадзянска-прававых адносін у яе былі ўцягнуты больш за 25 індывідуальных прадпрымальнікаў і каля 10 юрыдычных асоб. Сумесна з інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску была праведзена камеральная праверка на прадмет ухілення ад выплаты падаткаў. Была ўстаноўлена арганізацыйная сувязь паміж пэўнымі камерцыйнымі структурамі. Такім чынам удалося выйсці на асобу арганізатараў і кіраўнікоў арганізаванай групы.**

Установлена, што агульны даход падкантрольных арганізаванай групе камерцыйных структур у перыяд са студзеня 2021 года склаў каля 23 мільёнаў рублёў. Як адзначыў **начальнік аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў следчага ўпраўлення УСК па г. Мінску Максім ДЗЕГЦЯРОЎ**, дзейнасць арганізаванай групы была добра прадумана. У яе склад уваходзілі кіраўнікі ашуканскага бізнесу, кол-цэнтраў, менеджары па продажах, па падборы персаналу і яго навучанні, а таксама тэхнічныя спецыялісты. У групе існавала жорсткая іерархія. Усе ўдзельнікі строга выконвалі ўказанні кіраўніцтва.

У выніку ў розных рэгіёнах краіны затрыманы 56 чалавек, уключаючы арганізатараў схемы, бухгалтараў, бізнес-трэнераў і менеджараў. Шасці найбольш актыўным удзельнікам злачыннай схемы прад'яўлена абвінавачанне па ч. 4 арт. 209 (махлярства, учыненае арганізаванай групай) КК. Да іх прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, астатнія прызнаны падазраванымі. Следчыя правялі вобыскі ў офісах і памяшканнях, звязаных з дзейнасцю кол-цэнтраў. Накладзены арышт на маёмасць фігурантаў і падкантрольных ім юрыдычных асоб на агульную суму больш чым мільён рублёў.

# ВОДПУСК — ГЭТА ЗДАРОВА



### ГЕАГРАФІЯ ВІРУСАЎ

Згодна з данымі СААЗ эпідэміялагічная сітуацыя ў свеце па асобных інфекцыях, такіх як халера, чума, кантагіёзныя вірусныя гемарагічныя ліхаманкі Эбола, Ласа, Марбург, ліхаманка даліны Рыфт, жоўтая ліхаманка, хвароба, выкліканая вірусам блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому, воспа малпаў, застаецца напружанай. У асноўным гэтыя захворванні рэгіструюцца ў краінах Афрыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, Паўднёвай Амерыкі. Аднак з пашырэннем турыстычных маршрутаў рэгіструюцца завозныя выпадкі і на еўрапейскім кантыненце. З экзатычных краін, якія прымаюць турыстаў круглы год, а гэта Тайланд, Шры-Ланка, Інданэзія, Індыя, Мальдзівы, Дамінікана, можна прывезці захворванні, якія перадаюцца праз укусы насякомых: ліхаманку Дэнге і ліхаманку Заходняга Ніла. Таксама ў гэтых краінах, асабліва ў Індыі і на Гаіці, сустракаецца халера — кішэчнае захворванне, якое прыводзіць да поўнага абязводжвання арганізма.

Што ж прывозяць беларусы з далёкіх краін? Як расказаў **прафесар кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта Сяргей ЖАВАРОНАК**, найчасцей сустракаецца трапічная малярыя. Небяспечныя па гэтай інфекцыі рэгіёны — краіны Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі. Захворванне пераносяць камары, і для прыезджых яно смяротна небяспечнае. Сустракаюцца цяжкія выпадкі малярыі (да 10 у год), часам з лятальным зыходам. Яшчэ адно экзатычнае для нас захворванне — гепатыт А.

— Гэта інфекцыя, з якой у нас развіталіся два дзясяткі гадоў таму, але моладзь не мае імунітэту. Аднак ёсць вакцына, і можна сябе засцерагчы, — тлумачыць Сяргей Жаваронак. — Прафілактыка кішэчных інфекцый — гэта вельмі проста: чыстыя рукі і вада, а таксама ежа, якая павінна быць гарачай.

Былі выпадкі заражэння шыстасамозам, які дыягнастуецца надзвычай складана. Гэта хвароба, якую выклікаюць гельмінты-смактуны, і падхапіць яе можна ў вадаёмах. Ліхаманкі Эбола, Марбург не перадаюцца паветрана-кропельным шляхам, а пры кантактах, напрыклад, праз сувеніры, якія набываюць у экзатычных краінах, аднак апошнім часам яе не завозілі. А вось выпадкі ліхаманкі Дэнге здараюцца: яе прывозяць з Шры-Ланкі, Інданэзіі, Балі і Мальдзіў. Балазе далей самога захварэлага інфекцыя ў нашым клімаце не распаўсюджваецца. Здараецца, што завозяць і ВІЧ-інфекцыю, а тое, што вірус «імпартны», сёння нескладана даказаць з дапамогай сучасных лабараторных даследаванняў.

### ЯКІЯ МЕРЫ ПРЫНЯЦЬ ПЕРАД ПАЕЗДКАЙ?

Як адзначыла **загадчыца аддзялення асабліва небяспечных інфекцый аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анастасія ЛЯШКЕВІЧ**, перад планаваннем падарожжа неабходна звярнуцца да ўрача ў паліклініку па месцы жыхарства і ўдакладніць асаблівасці знаходжання ў той ці іншай краіне з улікам вашага стану здароўя. Варта ацаніць таксама свой імунны статус, бо ў шэрагу краін фіксуюцца ўспышкі адру, паліяміеліту, дыфтэрыі, слупняку і іншых хвароб, якія рэгулююцца вакцынацыяй. Гэтыя прышчэпкі ў нас робяцца па нацыянальным календары. Акрамя таго, важна загадзя ўдакладніць эпідэміялагічную сітуацыю ў краіне, якую збіраецеся наведаць.

Шэраг краін, небяспечных па жоўтай ліхаманцы, патрабуюць наяўнасці міжнароднага сертыфікату аб правядзенні вакцынацыі. Прышчэпку супраць гэтай інфекцыі можна зрабіць на базе 19-й сталічнай паліклінікі. Прышчэпка робіцца аднойчы і дзейнічае цягам усяго жыцця, адначасова выдаецца міжнародны сертыфікат.

### АД КАМАРОЎ ДА ВЯРБЛЮДАЎ

Каб пазбегнуць кішэчных інфекцый, варта не забываць мыць рукі, выкарыстоўваць сурвэткі, прамочаныя антысептыкам, кішэнныя спрэі. Важна захоўваць гігіену харчавання — не набываць ежу ў вулічных гандляроў, ужываць толькі прадукты гарантаванай якасці. Пры гатаванні ежы абавязковая тэрмаапрацоўка, асабліва гэта датычыцца морапрадуктаў, а ягады, зеляніну, гародніну і садавіну абавязкова старанна вымыць. Ваду рэкамендуецца ўжываць толькі бутыляваную ці кіпячоную.

У краінах, небяспечных па інфекцыйных захворваннях, якія перадаюцца з укусамі камароў, трэба загадзя паклапаціцца пра рэпеленты, насіць закрытае адзенне. У жыллі выкарыстоўваць механічныя сродкі — полагі, супрацьмаскітныя сеткі. Абавязкова выбіраць для падарожжаў толькі правераныя маршруты, не купацца ў вадаёмах, якія не адзначаны экскурсійнай праграмай. На пляжы лепш хадзіць у абутку, а ляжаць на падсцілцы ці шэзлонгу. Акрамя таго, каб не заразіцца высокапатагенным грыпам птушак, важна пазбягаць кантакту з дзікай і дамашняй птушкай. Таксама не кантактаваць з дзікімі жывёламі, якія могуць нанесці пашкоджанне, бо гэта пагроза заражэння шаленствам, ліхаманкай Марбург, воспай малпаў. Пры падарожжы ў краіны Блізкага Усходу варта памятаць, што вярблюды могуць быць крыніцай блізкаўсходняга рэспіраторнага сіндрому.



**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**У тэму**

### Чаму беларускія клінікі набіраюць папулярнасць у замежнікаў?

Колькасць замежнікаў, якія прыязджаюць у нашу краіну на лячэнне і аздараўленне, павялічваецца штогод. Экспарт медыцынскіх паслуг сёлета за чатыры месяцы склаў 14,38 мільёна долараў, што на 15 % больш, чым за аналагічны перыяд летась. Медыцынскія ўстановы прынялі 51 тысячу грамадзян са 137 краін свету, што на 12,4 % больш, чым за аналагічны перыяд у 2024-м. Адметна, што летась экспарт паслуг склаў 43,1 мільёна долараў, павялічыўшыся на 11 % у параўнанні з 2023-м.

Чаму медыцынскія паслугі ў нашай краіне карыстаюцца папулярнасцю ў замежнікаў? Як патлумачыў **загадчык сектара прасоўвання экспарту паслуг БДМУ Дзяржаўны аператар медыцынскага турызму «Клінікі Беларусі» Ян БЕДУШЭЎСКІ**, акрамя высокай якасці медыцынскіх паслуг і шырокага іх спектра, важная і цана пытання. На паслугі ў галіне траўматалогіі і артапедыі ў Беларусі расцэнкі ніжэйшыя за еўрапейскія ў сярэднім на 62 %, на кардыялагічныя, а таксама ў галіне неўралогіі і нейрахірургіі — на 48 %, лячэнне анкалагічных хвароб таннейшае на 44 %.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Инв. № | Общ. пл., кв. м | № м. м./№ кв. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лоты №№ 1–5: машино-место, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1** | | | | |
| 1 | 500/D-7988227728 | 13,7 | 26 | 21 360,00 |
| 2 | 500/D-7988227729 | 13,6 | 27 | 21 360,00 |
| 3 | 500/D-7988227730 | 13,3 | 35 | 21 360,00 |
| 4 | 500/D-7988227731 | 13,5 | 36 | 21 360,00 |
| 5 | 500/D-7988227732 | 13,3 | 37 | 21 360,00 |
| **Лоты №№ 6–12: квартира, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16** | | | | |
| 6 | 500/D-7988236244 | 105,3 | 65 | 389 600,00 |
| 7 | 500/D-7988236246 | 91,9 | 71 | 357 900,00 |
| 8 | 500/D-7988236248 | 81,1 | 75 | 315 800,00 |
| 9 | 500/D-7988236249 | 81,3 | 82 | 316 600,00 |
| 10 | 500/D-7988236250 | 91,9 | 85 | 357 900,00 |
| 11 | 500/D-7988236252 | 81,1 | 89 | 315 800,00 |
| 12 | 500/D-7988236253 | 91,8 | 92 | 357 500,00 |

Задаток 5 % от начальной цены лотов №№ 1–5, 1% от начальной цены лотов №№ 6–12 перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лотов №№ 1–5, 4 % от цены продажи лотов №№ 6–12 в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2025 (лоты №№ 1–5), 05.06.2025 г. (лоты №№ 6, 8–12), 20.05.2025 г. (лот № 7)

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.06.2025 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Лошницкий комбикормовый завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**весовая** для автомашин с инвентарным № 613/С-14084 общей площадью 140,7 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г;

**зерносклад** 1 емк. 3200 т с инвентарным № 613/С-14085 общей площадью 1 235,4 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/2;

**зерносклад** 2 емк. 3200 т с инвентарным № 613/С-14086 общей площадью 1 168,2 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/3;

**склад** 3 с инвентарным № 613/С-14087 общей площадью 880,9 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/4;

**навес** ж/б с инвентарным № 613/С-14088 общей площадью 764,2 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/1;

**здание** многофункциональное с инвентарным № 613/С-15474 общей площадью 77 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/5 (далее – объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623070004601000633 площадью 1,2763 га, адрес земельного участка: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г.

Начальная цена с НДС (20 %) – **380 215,64** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **38 021,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 36 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 11.02.2025, 12.04.2025.

**Аукцион состоится 07.07.2025 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.07.2025 до 16.00** по указанному адресу в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (01777) 25266, 8 (029) 312-28-85.

УНН 600033881

БЫЛА ВАЙНА

# ПЕРШЫЯ ЗАЛПЫ «КАЦЮШ»

## І апошнія... для капітана Івана Флёрава



**Ён нарадзіўся 24 красавіка 1905 года ў сяле Двурэчкі Ліпецкай вобласці. Скончыўшы земскую і школу фабрычна-заводскага навучання, як адзін з найлепшых выпускнікоў, працаваў майстрам, потым праходзіў тэрміновую службу ў артылерыйскіх часцях Чырвонай Арміі, вучыўся на курсах па падрыхтоўцы афіцэраў, застаўся служыць... У 1939 годзе быў залічаны слухачом Ваеннай артылерыйскай акадэміі, удзельнічаў у савецка-фінскай вайне, вызначыўся ў баях пры «лініі Манергейма». За праяўлены гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.**

...На сёмы дзень Вялікай Айчыннай вайны ў Маскоўскім артылерыйскім вучылішчы пачалося фарміраванне асобнай эксперыментальнай батарэі рэактыўнай артылерыі, на ўзбраенні якой мелася сем агнявых установак БМ-13 і адна 122-мм прыстрэлачная гаўбіца. Камандзірам батарэі быў прызначаны капітан Іван Флёраў. У ноч з 1 на 2 ліпеня байцы ў строгай сакрэтнасці адправіліся на Заходні фронт, пад Оршу.

Сюды ж, на буйны чыгуначны вузел, прыбывалі нямецкія эшалоны з гаручым, баявой тэхнікай і людзьмі для ўмацавання перадавых часцей, якія наступалі на Маскву. Днём 14 ліпеня 1941 года капітан Флёраў аддаў каманду: "Па фашысцкіх захопніках батарэяй — залп!». Праз некалькі імгненняў вогненная лавіна абрынулася на чыгуначны вузел...

Такі ж удар праз паўтары гадзіны быў нанесены на яшчэ адну занятую ворагам стратэгічную пазіцыю — пераправу цераз раку Аршыцу.

У сваіх успамінах «Салдацкі абавязак» Маршал Савецкага Саюза Канстанцін Ракасоўскі адзначаў: «Упершыню на нашым участку дзейнічала батарэя рэактыўнай артылерыі, так званыя «Кацюшы». Яна накрыла надыходзячую нямецкую пяхоту з танкамі. Мы вылезлі з акопаў і, стоячы ў рост, любаваліся эфектным відовішчам. Ды і ўсе байцы высыпалі з акопаў і, бачачы ўцёкі ворага, з энтузіязмам сустракалі залпы «Кацюш».

Эфект ад іх, першых, пад Оршай аказаўся неймаверным. Практычна на тыдзень было прыпынена наступленне фашысцкіх войскаў на смаленска-маскоўскім напрамку, дзякуючы чаму савецкія войскі атрымалі час на перагрупоўку сіл і ўмацаванне сваіх абарончых пазіцый. Але галоўнае ў тым, што паспяховыя дзеянні батарэі БМ-13 паслужылі штуршком да хуткага нарошчвання тэмпаў вытворчасці рэактыўнага ўзбраення для Чырвонай Арміі.



Амаль адразу ж пасля першых залпаў батарэя капітана Флёрава прадоўжыла свой гераічны шлях па франтавых тэрыторыях.

У ноч на 7 кастрычніка 1941 года недалёка ад вёскі Багатыр Смаленскай вобласці яна трапіла ў засаду і прыняла жорсткі бой. Апынуўшыся ў бязвыхадным становішчы, капітан загадаў ліквідаваць баявыя ўстаноўкі. Калі загад быў выкананы, сам Іван Флёраў даў залп з апошняй, а затым падарваў яе разам з сабой.

...Лёс камандзіра першай батарэі «Кацюш» доўгія гады заставаўся невядомым: капітан Флёраў лічыўся зніклым без вестак. Толькі восенню 1995 года група вяземскіх пошукавікаў выявіла астанкі сямі загінулых артылерыстаў на чале з капітанам. Героі былі ўрачыста перапахаваны каля вёскі Багатыр.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, капітану Івану Флёраву прысвоена званне Героя Расійскай Федэрацыі пасмяротна. Яго імем названы вуліцы ў Оршы, шэрагу расійскіх гарадоў, на радзіме — у вёсцы Двурэчкі. Легендарнай батарэі Івана Флёрава прысвечаны мемарыяльны комплекс «Кацюша» ў Оршы і помнік у вёсцы Пішчалава Аршанскага раёна. У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наведвальнікі з цікавасцю разглядаюць рэактыўную ўстаноўку БМ-13.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,** *г. Мінск.*

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

# «...ЖЫЦЬ, КАБ СЛУЖЫЦЬ — БОГУ І ЛЮДЗЯМ»

**Бацькі гэтага дзіцяці працавалі бухгалтарамі і вельмі не хацелі, каб яно, іх адзінае, звязала лёс з лічбамі, але ж і з музыкай...**

Непаслухмяная дзяўчынка вырашыла ўсё па-свойму: паступіла ў музычную школу, стала вучыцца іграць на фартэпіяна, і бацькам прыйшлося купіць інструмент, выплачваць крэдыт за піяніна «Беларусь».

З адзнакай скончыўшы школу, потым Маладзечанскае музвучылішча, маладая выпускніца апынулася ў Гальшанах.

— Энергія тады біла цераз край, — успамінае Тамара Фёдараўна. — Я паступіла на завочнае ў наш інстытут культуры, навучылася кіраваць машынай, атрымала правы, стала спяваць у народным хоры «Крыніца», выйшла замуж, нарадзіла сына... Да таго ж у нашым шматкватэрным доме яшчэ жылі ўдзельнікі вайны. Яны нярэдка збіраліся за адным сталом і пад маю музыку спявалі — «Кацюшу», іншыя песні... Такім чынам я ніколі не высыпалася — у сутках не хапала гадзін!.. Сёння з вышыні пражытых гадоў разумею, што брала на сябе зашмат, але інакш не магла — бацькі прывучылі да ўсяго ставіцца з адказнасцю...

А ўжо да справы — тым больш. Калі выкладала ў Ашмянскай дзіцячай музычнай школе, Тамара Фёдараўна Жданава старалася зрабіць цікавым сам працэс навучання: ладзіла віктарыны, семінары, конкурсы, алімпіяды...

Пасля вучобы, вядома ж, не ўсе яе выхаванцы сталі музыкантамі, але многімі выпускнікамі педагог шчыра ганарыцца. Сярод іх дырэктары музычных школ Смаргоні і Гальшан Наталля Ялфімава і Анастасія Сабалеўская, выкладчык універсітэта культуры Ніна Ролік, музыкант аркестра імя Міхаіла Фінберга Алена Мінойць, спявачка акадэмічнай капэлы імя Рыгора Шырмы Наталля Дзямідава... Таццяна Данілевіч звязала жыццё з тэлебачаннем...

— У маладыя гады падумвала аб спакойным жыцці на пенсіі, — прызнаецца Тамара Фёдараўна. — Але ж яно, тое спакойнае, мусіць, не па мне. Шмат займаюся з унучкай Машай — хачу ўбачыць яе выдатнай цымбалісткай, кожны дзень бываю на лецішчы. У сезон вырошчваю там агародніну, зімой кармлю ката. Вельмі люблю хадзіць у грыбы і ягады, а ўжо вандраваць... У савецкія часы па камсамольскіх пуцёўках наведала Балгарыю, Польшчу, пабывала ў Маскве, Ленінградзе, пакупалася ў Чорным і Балтыйскім марах. Апошнім часам паездзіла па святых мясцінах Расіі (востраў Валаам, Дзівеева, Опціна, Пскоўска-Пячэрская лаўра) і, вядома ж, па Беларусі.

— Я шчаслівая, — прызнаецца жанчына. — Мне хочацца жыць і жыць... Каб служЫЦЬ Богу і людзям.

**Мікалай БАЛЫШ,** *г. Ашмяны.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукционов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и права аренды земельных участков, на которых они расположены, сроком на 20 лет

Аукционы состоятся **21 июля 2025 года в 14.00** по адресу: 225510, Брестская область, г. Столин, ул. Советская, 69.

